Лічу неабходным падкрэсліць, што гэтае пытанне патрабуе дадатковай працы, каб зняць паўторы і, можа быць, некаторыя тэмы, творы кампазітараў, якія вывучаліся да паступлення ва універсітэт, даваць для больш паглыбленага самастойнага вывучэння і, можа быць, нават некаторыя пытанні ўключаць у экзаменацыйныя білеты.

Ёсць пэўная спецыфіка, якую трэба таксама ўлічваць і на занятках па спецінструменту. Тут неабходна мець на ўвазе перш за ўсе тое, што студэнт да таго, як паступіў вучыцца да нас, набыў ужо шэраг спецыфічных навыкаў, якія сфарміравалі ў яго выкладчыкі музычнай школы, а пасля - музвучылішча ці вучылішча мастацтваў. За гады дауніверсітэцкай вучобы ім ўжо выконваўся нейкі рэпертуар. І галоўная задача выкладчыка не разбурыць тое добрае, што было зроблена да яго, а вельмі ўважліва і з павагай аднесціся да гэтага, нават калі і не зусім падзяляеш некаторыя прынцыпы, напрыклад трактоўкі твораў, пастаноўкі дыхання, рук і інш. Калі выкладчык пачне навязваць студэнту свае прынцыпы і ганіць тых выкладчыкаў, якія былі да яго, то нярэдка гэта прыводзіць да спынення прафесійнага росту студэнта ці да канфлікту паміж студэнтам і выкладчыкам. Вось чаму вельмі важна ведаць не толькі рэпертуар, які студэнт выконваў да паступлення ва універсітэт, але, можа, нават пазнаёміцца з выкладчыкам, які рыхтаваў гэтага студэнта, бо гэты выкладчык можа паведаміць аб яго моцных і слабых баках. Усё гэта будзе садзейнічаць больш грунтоўнай падрыхтоўцы спецыяліста высокага ўзроўню.

Не менш складаная задача стаіць і перад кафедрамі харэаграфіі, тэатральнай рэжысуры, народных рамёстваў. Тут таксама трэба не толькі добра ведаць праграму, па якой вялася падрыхтоўка былых абітурыентаў, але і асаблівасці школы таго ці іншага выкладчыка.

У заключэнне трэба падкрэсліць, што ў сувязі з пераходам універсітэта на двухузроўневую сістэму падрыхтоўкі спецыялістаў - бакалаўраў і магістраў - пераемнасць падрыхтоўкі неабходна разглядаць адным з важнейшых кампанентаў павышэння ўзроўню гуманітарнай адукацыі.

У сувязі з гэтым мэтазгодна вучылішчы культуры, мастацтваў, музвучылішчы ўключыць у агульную сістэму культуралагічнай падрыхтоўкі, дзе вядучым звяном будзе Беларускі універсітэт культуры. Неабходна тэрмінова ўзгадніць вучэбныя планы вучылішчаў з планамі універсітэта па адпаведных спецыяльнасцях. У працэсе ўзгаднення забяспечыць пераемнасць і не дапусціць дубліравання.

На наш погляд, было б мэтазгодным вырашыць пытанне аб пераўтварэнні асобных вучылішчаў мастацтваў (і ў першую чаргу Мінскага) у каледжы, зрабіць іх шматпрофільнымі. Гэта менавіта будзе садзейнічаць павышэнню ўзроўню і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў як сярэдняга, так і вышэйшага звёнаў.

Лягчылаў А.К.,
прарэктар па навуковай рабоце
Беларускага універсітэта культуры

## АБ ПАДЫХОДАХ ДА АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ Ў ВНУ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВА

Айчынная навука, як і грамадства, перажывае пэўны крызіс, які стаў асабліва абвастрацца ў апошнія гады. Знізілася якасць навуковых распрацовак, значна зменшылася колькасць перыядычных выданняў. І гэта толькі невялікая частка з шэрагу праблем, што перашкаджаюць нармальнаму развіццю навукі. Наогул, сёння, як ніколі, патрэбна ў цэнтралізавана-праграмнай форме вырашаць усе пытанні выхаду з гэтага крызісу. І, канешне ж, у першую чаргу пільная ўвага павінна быць звернута на фінансавае забеспячэнне даследаванняў.

Як вядома, яшчэ ў нядаўнія часы навука ў нас была арганізавана ў адрозненне ад існуючай ва ўсім свеце практыкі па-асобаму. Таму сёння ва ўмовах рынкавых адносін у развіцці эканомікі фінансаванне навукі патрабуе перагляду.

У нашай рэспубліцы фундаментальныя і прыкладныя даследаванні сканцэнтраваны ў трох асноўных структурах: акадэміі навук, навучальных установах і ў галіновых навукова-даследчых інстытутах і КБ.

Прыкладная навука заўсёды ва ўсім свеце традыцыйна фінансуецца на гаспадарчаразліковых пачатках фірмамі і прадпрыемствамі. Гэты падыход часткова сёння існуе і ў нас, і няма сумненняў, што ён павінен быць распаўсюджаны паўсямесна. Найбольш складанае пытанне -- гэта фінансаванне фундаментальных і пошукавых работ, якія заўсёды падпітваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з бюджэту дзяржавы. Любому ўраду вядома, што ўкладанне грошай у фундаментальныя даследаванні забяспечвае будучыню дзяржавы.

Але сённяшнія няпростыя ўмовы паказваюць і недарэчныя адносіны да тых даследаванняў, якія, на першы погляд, з'яўляюцца і не такімі ўжо надзённымі. Безумоўна, у першую чаргу гэта тычыцца такой галіны, як культура. Не шмат выдзяляе дзяржава грошай на яе развіццё, тым больш на навуковыя даследаванні ў гэтай галіне.

Кажуць, калі ў чалавека няма маці, ён сірата, калі няма культуры, сірацее нацыя. Беларускі універсітэт культуры за ўсе гады падпарадкавання Міністэрству культуры аказаўся сіратою ад навукі, не атрымаўшы ні рубля на падтрымку навуковых распрацовак. А кола інтарэсаў навукоўцаў універсітэта багатае, разнастойнае і цікавае. Што тычыцца універсітэцкага навуковага патэнцыялу, то ён мае даволі высокі рэйтынг. 21 прафесар, доктар навук, 151 кандыдат навук, дацэнт працуюць у сценах навучальнай установы. Гэта каля 50% ад агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу. Сіламі выкладчыцкага калектыву універсітэта вядзецца распрацоўка 31 тэмы па розных накірунках тэорыі і гісторыі культуры. Сярод іх "Літаратура ў кантэксце абнаўлення духоўнай культуры на сучасным этапе", "Культура ў сістэме эканамічных адносін", "Станаўленне і развіццё культурна-асветніцкіх устаноў Беларусі ў 20-30-я гады на падставе новых гістарычных канцэпцый", "Беларуская харэаграфія: гісторыя і сучаснасць" і многія іншыя. Фінансавая падтрымка дзяржавай гэтых даследаванняў магла б забяспечыць не толькі пэўныя выдаткі на распрацоўку тэм, але і на выданне часткі даследаванняў як вучэбна-дапаможных матэрыялаў (падручнікаў, дапаможнікаў) для навучання студэнцкай моладзі. На паліцах выдавецтваў, напрыклад, пыліцца манаграфія прафесара Г.І.Барышава "Гісторыя, паэтыка батлейкі", якая магла б ужо сёння стаць цікавым, унікальным падручным матэрыялам для студэнтаў.

Такая ж сітуацыя складваецца і з дзейнасцю навуковых лабараторый. Адна з іх, галіновая навукова-даследчая танцавальнай творчасці, прыпыніла сваё існаванне з-за адсутнасці фінансавых сродкаў, і гэта нягледзячы на тое,што яна з'яўлялася адзіным цэнтрам на ўвесь былы СССР, дзе для пераймання вопыту збіраліся вядучыя спецыялісты ў галіне танцавальнага фальклору.

Вяртаючыся да першапачатковых разважанняў, можна вызначыць тры асноўныя шляхі ў фінансаванні навуковых распрацовак. Папершае, фінансаванне навучальных устаноў, якія займаюцца фундаментальнымі і навуковымі даследаваннямі. Па-другое, фінансаванне па спецыялізаваных праграмах канкрэтных навуковых распрацовак. У нашым выпадку гэта праграмы Міністэрства культуры і друку.Патрэцяе, фінансаванне малых навуковых калектываў, асобных лабараторый альбо работ супрацоўнікаў на аснове сістэмы грантаў.

На сённяшні дзень большая частка фінансавых сродкаў перадаецца Навукова-даследчаму інстытуту праблем культуры, які, не маючы дастаткова ўласных навуковых сіл, у асноўным скіроўвае сваю дзейнасць на стварэнне часовых навукова-творчых калектываў. У іх склад уваходзяць навукоўцы вышэйшых навучальных устаноў культуры і мастацтва. Моцны ж навуковы патэнцыял саміх гэтых устаноў з поспехам мог бы выканаць многія задачы ў рамках сваёй зацверджанай навуковай тэматыкі па першых двух пунктах прапанаванай мадэлі фінансавання.

Астатняе ж, не ўмаляючы ніколькі значэння гэтай навуковай установы, мог бы здзейсніць і НДІ праблем культуры. Галоўным з'яўляецца разумнае выкарыстанне тых невялікіх сродкаў, якія выдзяляюцца на навуковы пошук у галіне культуры.

Пазнякоў В.У.,
прарэктар па навучальнай рабоце
Нацыянальнага інстытута гуманітарных навук

## КУЛЬТУРАЛОГІЯ: ПРАБЛЕМЫ СТАНДАРТАЎ

Пераход да многаузроўневай сістэмы адукацыі ў якасці сваёй перадумовы мае распрацоўку стандартаў. У найбольш агульным разуменні стандартызацыя адукацыі ўяўляе працэс, накіраваны на ўпарадкаванне трансліруемага культурнага вопыту. У больш канкрэтнай інтэрпрэтацыі стандарты закладваюць крытэрыяльна-базавыя патрабаванні да ўсяго зместу навучальна-адукацыйнай дзейнасці. Такім чынам, зусім не прэтэндуючы на поўны пералік, вызначым найбольш істотныя тыпы стандартаў:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ